Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem

Цана асобнага нумару 20 грош.

НАРОДНАЯ СПРАВА

Выходзіць два разы ў тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6. (Wileńska 12, m. 6). Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл.50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр. Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 13 Вільня, Аўторак, 31-га жніуня 1926 г. Год I.

Камісар Ураду на м. Вільню сканфіскаваў № 12 „Народнае Справы“ з 28-га жніўня за зьмяшчэньне стацей: „Амністыя і школа“, „Паход проці Грамады“ і „Справа 32-х“.

У нас недарод, а хлеб вязуць заграніцу!

Ніжэй мы зьмяшчаем цыфровыя даныя, з якіх відаць, што сёлетні ўраджай у Віленшчыне і Наваградчыне—дужа благі, асабліва ў падгранічных паветах. У Віленшчыне недабор збожжа дасягае 500.000 цэнтнэраў; у Наваградчыне, у якой звычайна быў лішак збожжа — на вываз, збор хлеба крыху лепшы, чым у Віленшчыне, але ўжо аб лішцы дзеля вывазу ня можа быць і гутаркі.

Гэтак пацярпеўшыя паветы Заходняе Беларусі будуць прымушаны сёлета зьнекуль прывазіць збожжа—і на хлеб, і на насеньне. Праўда, у каранной Польшчы хлеба ёсьць аж з лішкам, дык, здаецца, няма аб чым клапаціцца. Але гэта адно толькі так здаецца.

Справа ў тым, што польскія прадуцэнты збожжа (абшарнікі) з дазволу ураду пачалі масамі вывазіць хлеб заграніцу, дзе таксама сёлета недарод, і цэны стаяць высокія. У выніку гэтага вывазу збожжа з краю ў-ва ўсей Польшчы цана на хлеб пачала шыбка расьці і з 3 даляраў за 100 кіляграмаў падскочыла ўжо да 4 дал., імкнучыся зраўняцца з замежнай цаной. Такім парадкам палажэньне нашага сялянства на ўсходнім узьмежку нашае краіны робіцца падвойна цяжкім: раз затым, што свайго хлеба няма, а другое — што прыкупіць яго з прычыны дарагоўлі няма за што, ды к вясьне цэны будуць яшчэ вышэйшыя!

Ведама, аб асадніках і абшарніках ёсьць каму паклапаціцца: ўся польская прэса ўжо падымае гвалт, каб урад іх забясьпечыў хлебам! Аб нашых-жа сялянах нікто клапаціцца ня будзе, — асабліва ж, калі яны сядзеціміуць моўчкі і чакаціміуць нейкае цудоўнае „манны з неба“. Вось-жа мы і заклікаем нашу пацярпеўшую вёску адгукнуцца, падаць свой голас аб сваім палажэньні і патрэбаваць сабе дапамогі, патрэбаваць перадусім, каб урад спыніў вываз хлеба заграніцу і гэтак недапусьціў далейшае спэкуляцыі абшарнікаў на народным голадзе.

Тут гожа адзначыць, што навет паводле газэты „Głos Prawdy“ (орган пілсудчыкаў) віна за ўтварыўшаеся палажэньне на хлебным рынку ляжыць на ўрадзе. Урад ня толькі дазволіў неабмяжована вывазіць з Польшчы хлеб заграніцу, але й даў абшарнікам вялізарныя грошы—**20 мільёнаў злотых**—на правядзеньне вывазных опэрацыяў. І характэрна тут тое, што гэныя грошы, дадзеныя абшарніцкаму саюзу „Коопрольна“, паны ўжо „проспэкулявалі“ так няўдачна, што на зварот іх у скарб няма надзеі. А яшчэ больш цікаўна, што, паводле таго-ж „Głosu Prawdy“, летась сталася акурат тое-ж самае, і ўраду дадзеныя абшарнікам на арганізацыю экспорту збожжа заграніцу 20 мілёнаў таксама не вярнулі! Гэтак абшарнікі змарнатравілі на свае спэкуляцыі ажно **40 мілёнаў злотых дзяржаўных грошы**—знача грошы, якія з такімі страшэннымі труднасьцямі спаганяюцца з сялянскіх масаў!...

Сялянства не павінна моўчкі глядзець на ўсё гэта, павінна голасна дамагацца, каб урад, які мае грошы для абшарнікаў, знайшоў іх і для нашага пацярпеўшага ад недароду сялянства!

Ігра з вагнём.

Здарэньні, аб якіх нас паведамляюць з Крынак і Алекшыцаў, Горадзенскага пав., упісываюць новыя факты ў гісторыю Заходняй Беларусі пад Польшчай.

Новымі зьяўляюцца і тактыка мясцовай адміністрацыі, і тое, як рэагуюць на яе крыўджаныя адміністрацыяй народныя масы...

Дагэтуль пасольскія мітынгі—або забараняліся ўладай, або, як было яшчэ раней, — дазваляліся, але зрываліся арганізаванай тэй-жа паліцыяй у змове з асадніками і шпікамі азброенай „апашыі“... Цяпер прынята, як відаць з аднолькавасьці тактыкі ў Крынках і Алекшыцах, новая сыстэма, прынамся ў Горадзеншчыне. Гэтая новая сыстэма адзначаецца тым, што дазвол на мітынг даецца, але перад самым пачаткам пасольскай прамовы, на якую ўжо чакае некалькі-тысячная таўпа сялян, зьехаўшыхся з усей ваколіцы, прыходзіць забарона...

Хто хаця крыху ведае ці чуў аб тым, што навука заве „псыхалёгіяй таўпы“, той ведае, што у гэткі мамэнт прамоўца, ці так-званы „адказны кіраўнік“ мітынгу робіцца ў такой меры залежным ад таўпы, у такой меры зьвязаным з ёй, што рваць гэтую сувязь, ламаць настрой і сьдзяваньні таўпы—рэч больш, чым небясьпечная. Ці ведаюць гэта прадстаўнікі горадзенскай адміністрацыі, ці сьвядома яны хочуць выклікаць гэтую небясьпеку, мы судзіць тут ня будзем.

Але ў абодвух выпадках тыя, што дазваляюць сабе так іграць магчымасьцю праліцьця крыві, ня могуць быць пакінуты на іх становішчах ніводнага дня далей...—Бо-ж, — калі гэта робіцца сьвядома, дык гэткая сыстэма мае бясспрэчны і точны назоў правакацыі; калі гэта робіцца „нясьвядома“, а „так сабе“, дык гэткім паном з недасьпелым розумам тым больш ня мейсца на тых адказных становішчах, якія яны занялі. Але, калі, як ясна кожнаму, прадстаўнікі горадзенскай адміністрацыі не аказаліся адпаведнымі дзеля свайго становішча, дык трэба сьцьвярдзіць, што зусім і цалком на вышыні адказнага мамэнту і важнасьці сваей ролі апынуўся пасол з „Грамады“ Валошын: толькі дзякуючы яго прысутнасьці духа, энэргіі, тактоўнасьці—ўся справа ў абодвух мейсцах абыйшлася без вялікшага праліцьця крыві...

Мы лічым сваім абавязкам з усей рашучасьцяй запратэставаць тут проці гэтае новае сыстэмы барацьбы польскае адміністрацыі з „Грамадой“.

У в. Алекшыцах, Горадзенскага пав., на Спаса (6/19 жніўня) адбываецца вялікі фэст. У гэты дзень Бел. Сял.-Раб. Грамада пастанавіла склікаць тут пасольскі мітынг, на якім меўся прамаўляць дэпутат Валошын.

Дазвол ад горадзенскага старасты быў своечасна атрыманы на пісьме. На гэтай падставе народ быў загадзя апавешчаны аб мітынгу, на які зьехалася і зышлося больш за 5.000 душ. Зьехалася і паліцыя ажно з трох пастарункаў, ды з Горадні прыехаў шэф дэфэнзывы з цэлым штабам агентаў.

У назначаны час пасол Валошын узышоў на воз і, прачытаўшы дазвол старасты на веча, дадаў, што ў самы мамэнт яго ад'езду з Горадні паліцыянт прынёс яму ад старосты новую паперу — ўжо з забаронай дазволенага мітынгу. Аднак, уважаючы на тое, што ня было ўжо магчымасьці паведаміць аб гэтай зьмене народ, які так людна сабраўся, і спаўняючы волю сабраўшыхся, — ён, пасол Валошын, будзе прамаўляць да сабраных.

Пачуўшы гэту заяву, паліцыя кінулася разганяць веча. Узьнялася тузаніна. Адзін селянін схапіў пры гэтым за ружжо паліцыянта, каб адвясьці яго ад сябе штых яго. Яго хацелі зарыштаваць за гэта, але ўзьняўся крык: „ня дацы“—і не далі. Калі другі паліцыянт, Лошовскі (з Індурскага пастарунку), прыставіў штых да грудзей хлопца Лявона Калесьніка з в. Жукевічы, які не адступаў, дык хлопец, ня скрануўшыся, крыкнуў яму: „калі, а я не адступлю!“ Паліцыянт апусьціў штых. І гэта быў пераломны мамэнт у настрою таўпы, якая ўжо сама пачала націскаць на паліцыю.

Бачучы, што справа можа скончыцца дужа паважна, пасол Валошын зьвярнуўся да паліцыі з славамі: „Паны паліцыянты, калі будзеце разганяць сілай, дык я ня ручаюся, што і з другога боку ня дойдзе да гвалту, і канец можа быць сумны!“. Паліцыя, бачучы, што сілы запраўды няроўныя, адступілася, а ўзбуранае пяцітысячнае таўпы пас. Валошын супакоіў тым, што пачаў сваю прамову.

Дзякуючы гэтаму ўсё супакоілася, і мітынг дайшоў да канца ў поўным парадку. Пасол гаварыў аб палітычных вязьнях, аб дарагіх судох, аб беларускай школе, аб „свабодзе слова“ і г. д. Прамова была спаткана бурай воплескаў, а пасла абсыпалі кветкамі. Урэшце была прынята рэзалюцыя з дамаганьнем амністыі, нацыянальнай волі, зямлі сялянам бяз выкупу, скасаваньня асадніцтва, дапамогі безработным, увядзеньня работніцкага кантролю на фабрыках, пераладжаньня падаткаў на заможныя клясы і ўтварэньня сялянска-работніцкае ўлады.

На мітынгу, скліканым горадзенскай арганізацыяй „Грамады“ ў Крынках, Горадз. пав., адбылося блізу тое-ж самае, што і ў Алекшыцах. І тут староста перш даў дазвол на мітынг, а пасьля—у апошні мамэнт, калі народ быў ужо скліканы,—узяў свой дазвол назад. На гэтай падставе адказны гаспадар мітынгу перад многатысячнай таўпой заявіў, што мітынг адбыцца ня можа, дык ён яго распускае. Але з таўпы пачуліся крыкі пратэсту й абурэньня. Народ пачаў трэбаваць, каб пасол Валошын прамаўляў, ня гледзячы на забарону старосты. Паліцыя кінулася разганяць,—народ не паддаваўся. Бачучы, што й тут справа можа скончыцца праліцьцем крыві, пасол распачаў прамову і гэтак разагнаў буру. Як і ў Алекшыцах, усё скончылася мірна і складна, — з авацыямі для прамоўцы і прынятым рэзалюцыі, аналягічнай з рэзалюцыяй у Алекшыцах.

І тут і там толькі спакой і рашучасьць пасла Валошына не дапусьціла да крывавых падзеяў, справакаваных бястактоўнасьцяй горадзенскага старасты.

„Скачы, уража, як пан кажа!“

Пасьля даўжэйшага перарыву, выкліканага спыненьнем выдачы ўрадавае дапамогі, выйшаў у сьвет новы нумар паўлюкевічаўскае часопісі „Беларускае Слова“.

Відаць, „доктару“ памагло тое падтрыманьне, якое аказалі яму польскія „казённыя дэмакраты“ з газэты „Kurjer Wileński“, якія друкавалі ў сябе—замест перадавіц! — бруды, выліваныя Паўлюкевічам на беларускіх пасолаў.

Нумар „Белар. Слова“ блізу ўвесь запоўнены ілжывымі даносамі на беларускіх грамадзкіх дзеячоў, ды ўсялякай брахнёй, якой „доктар“ прабуе запалохаць беларускае сялянства, каб ня йшло ў „Грамаду“. Ведаючы, што за ўчасьце ў легальнай партыі нікога караць ня могуць (—каб маглі, дык не чакалі-бы ні мінуты!), Паўлюкевіч у адозьве, самазванна напісанай ім ад імя „Беларускай Нацыянальнай Рады“, зьмяшчае розныя брэдні аб „Грамадзе“ і кажа, што ўсе сябры яе пападуць за краты!

Сьмешныя гэныя страхі: відаць, ня маюць нашыя няпрошаныя „апякуны“ іншых способаў змаганьня з „Грамадой“, калі карыстаюцца ўслугамі Паўлюкевіча і такімі наіўнымі пагрозамі! Запраўды ж: труднавата пасадзіць у вастрогі дзесяць тысяч сяброў партыі!

Вясьці палеміку з „Бел. Словам“, ды тлумачыць, што ўсе заявы Паўлюкевіча аб нашых даданых барацьбітах — гэта брахня, — лічым зусім лішнім: піша Паўлюкевіч тое, што яму прыказваюць яго́ныя „працадаўцы“, сам найлепш ведаючы цану сваіх слоў. Справядліва-ж кажа народная прыказка: „скачы, ўража, як пан скажа!“...

У нядзельным нумары „Kur. Wil.“ віцэ-старшыня „Бел. Нац. Рады“ (б. „Часовае Рады“) Ф. Аляхновіч надрукаваў ліст, у якім пратэстуе проці зьмяшчэньня Паўлюкевічам пад ягонай уласнай „адозвай“ подпісу „Рады“: ніхто з сяброў гэнае „Рады“ навет ня ведаў нічога аб паўлюкевічаўскім выступленьні, на якое „доктар“ ня меў паўнамоцтва ад „Рады“.

Вось табе і „Рада“!...

На падставе загаду Міністэрства Асьветы заняткі ў ва-ўсіх школах (народных і сярэдніх), а таму й у Віл. Бел. Гімназіі, пачнуцца 15 верасьня. Экзамены і пераэкзаменоўкі адбудуцца 13 і 14 таго-ж месяца.

Дырэкцыя.

У Польшчы.

Канфлікт у лоне габінэту.

Варшаўскія газэты пішуць, што між прэм'ерам Бартлем і марш. Пілсудскім выбухнуў канфлікт—з прычыны грашовых дамаганьняў ваеннага міністра. Як ведама, міністар фінансаў Клярнэр працівіцца—з пункту гледжаньня польскага скарбу — дамаганьням міністра Пілсудскага, каб былі асыгнаваны новыя крэдыты на дадаткі ваенным.

Прэм. Бартэль стаў на бок мін. фінансаў. Тады быццам Пілсудскі заявіў, што знойдзе іншага прэм'ера... Называлі навет ужо і новага прэм'ера: міністра зямляробства Рачыньскага.

Расцэнка „найдаражэйшай крыві.

Газэты падалі параўнаньне пэнсіяў вайсковых і цывільных урадоўцаў у Польшчы — пасьля таго, як марш. Пілсудскі зрабіў вельмі значныя дадаткі афіцэрам арміі.

Найвышэйшы афіцэр у арміі—маршалак Польшчы, ён-жа ваенны міністар, ён-жа генеральны інспэктар арміі, мае, апрача дадаткаў на сям'ю і іншых, у месяц — 2.334 зл. Найвышэйшы цывільны ўрадовец (ня лічучы прэзыдэнта) прэм'ер, мае толькі—1.234 зл. Генарал броні мае—1.732 зл. Міністар толькі—1.062 зл. Генарал дывізіі мае—1.374 зл. Віцэ-міністар мае толькі—830 зл. Генарал брыгады мае—1.070 зл. Ваявода мае—658 зл. Капітан мае—476 зл. Староста мае—301 зл. і г. д.

Яшчэ больш цікава параўнаньне пэнсіяў ваенных з пэнсіямі прафэсароў вышэйшых і сярэдніх школаў.

Прафэсар гімназіі, з вышэйшай асьветай, мае толькі—239 зл. у месяц. А вось пан падпаручнік мае 289 зл. Той-жа прафэсар пасьля 6 гадоў працы ў школе мае — 301 зл. Той-жа пан падпаручнік, даслужыўшыся да паручніка, мае ўжо — 371 зл. Прафэсар унівэрсытэту (вышэйшай школы) мае толькі — 529 зл. Пан маёр (раўняючыся з ім службовым „рангам") мае аж—670 зл. Прафэсар штатны мае толькі — 658 зл. Пан палкоўнік за тое мае аж—855 зл.

З гэтай табліцы зусім ужо для кожнага ясна, што значаць словы марш. Пілсудскага аб „найдаражэйшай крыві ў Польшчы".

Газэты паведамілі, што ўрад Бартля-Пілсудскага цяпер, пасьля надбавак паном афіцэрам, робіць дадаткі — у парадку паступовай чаргі „даражыні крыві ў Польшчы"—паном паліцыянтам. Што-ж датычыць усей цывільнай арміі дзяржаўных урадоўцаў, дык яе дзіўныя „прэтэнсіі на дадаткі" дагэтуль ня маюць надзеі на здаваленьне ..

Старажы парадку і моральнасьці.

У „Голасе Праўды" былі важны чыноўнік міністэрства раскрыў праўду аб парадках, якія пануюць у варшаўскай угалоўнай паліцыі. „Праца" варшаўскай паліцыі ідзе ў хэўры і паразуменьні з зладзеямі. Большасьць служачых паліцыі набрана з зладзеяў, дык працуе зусім не на карысьць пацярпеўшых. Крадзеныя рэчы выкупаюцца ў зладзеяў, калі абакрадзены дасьць „выкуп" паліцыянтам. Часта-густа паліцыя шантажуе жыдоўскіх гандляроў, і г. д. і г. д.

Гэтак—ў Варшаве. А ў іншых местах—ці-ж інакш... А што-ж ужо казаць пра мястэчкі ды вёску, дзе мяйсцовы паліцыянт—цар—і бог.

Радіо—для барацьбы з бандытамі і небандытамі на крэсах.

Міністар чыгункі мае пабудаваць на вузлавых станцыях „ўсходніх ваяводзтваў" радіо-апараты (тэлеграфы бяз дротаў), каб сыгналізаваць аб нападах бандытаў.

Першае выступленьне ката ў Польшчы...

У Кракаве адбылося першае выступленьне спэцыяльнага ката, нанятага міністрам справядлівасьці для выкананьня кары сьмерці. Кат Мацеевскі выканаў прысуд сьмерці праз павешаньне над бандытам Зеліньскім, забіўшым касіршу Парэмбскую.

Цікаўна, што на сваю агідную „працу" кат міністэрства справядлівасьці выфрантаваўся, як на баль: у чорным фраку дый у белым кравацe і белых рукавічках... — Недарма-ж: культурны кат у культуральнай дзяржаве!

Як ведама, пан дзяржаўны кат у Польшчы мае навет вышэйшую асьвету: ён — доктар мэдыцыны...

Газэты пішуць, што першы „блін" ня ўдаўся пану кату: вяроўка парвалася, дык ён змушаны быў сам падтрымліваць яе за другі канец, пакуль павешаны ня кончыўся...

Заграніцай.

Маніфэст англійскіх работнікаў.

Незалежная работніцкая партыя (лявіца „Партыі Працы") выдала маніфэст, у якім звараче ўвагу ўсяго сьвету на небясьпеку для міру з прычыны замежнай палітыкі Польшчы. Маніфэст сцьвярджае, што як народ літоўскі, таксама і народы Расеі пераканаты ў тым, што між марш. Пілсудскім і Чэмбэрленам адбылося паразуменьне ў справе ваеннага нападу на Літву. Далей маніфэст сцьвярджае, што польскі налёт на Літву бясспрэчна выклікаў-бы адпаведную акцыю з боку Расеі... А далей—выступленьне Расеі ўцягнула-б у вайну і рад іншых дзяржаў, і гэткім шляхам узгарэлася-б новая сусьветная вайна... У канцы маніфэст заклікае работнікаў усяго сьвету, каб бясспынна сачылі за пагражаючай небясьпекай, націскаючы на сваі ўрады. А ў разе канфлікту між Польшчай і СССР — каб работнікі з'арганізавалі такое-ж спраціўленьне, як і 6 гадоў таму, калі англійскія работнікі—не дазволілі англійскаму ўраду падтрымаць Польшчу проці СССР...

Цэнтральны Сэкрэтарыят Грамады гэтым паведамляе, што павятовы зьезд Грамады у Горадні адкладаецца на 19-га верасьня.

Ліга Народаў.

2-га верасьня пачнуцца паседжаньні Рады Лігі Народаў—пад старшынствам мін. Бэнэша. На парадку дня пастаўлены справы аўстрыйскіх, вэнгерскіх і данцынгскіх фінансаў, якія знаходзяцца пад кантролем Лігі; справа канфлікту аўтаномнага сойму Клайпэды з ковенскім урадам; урэшце — найважнейшая справа рэформы Рады Лігі.

Нямецкія газэты пішуць, быццам урады Англіі, Францыі і Нямеччыны дайшлі да паразуменьня ў справе выбараў у Раду Лігі. Сталае мейсцца атрымае цяпер толькі Нямеччына. Польшча і Гішпанія (відаць, як „паўвялікія дзяржавы") маюць быццам атрымаць „паўсталыя" мейсцы на 3 гады — з правам перавыбару на далейшыя 3 гады. Быццам і Польшча і Гішпанія ўжо згадзіліся на гэткае вырашэньне справы, дамагаючыся абедзьве толькі „за гэта" — розных гаспадарчых і палітычных уступак ад вялікіх дзяржаў. Гішпанія вяжа з сваей „уступкай" справу адданьня пад яе выключны загад порту Танжэр, які мае вялізарнае значэньне для ўтрыманьня яе ўлады над сваім Мarокко. Польшча за сваю „ўступку" паловы свэей „моцарствовасьці" дамагаецца ад Нямеччыны, каб тая дапусьціла „вольную руку" польскага ўраду—у выкіданьні з Пазнаншчыны немцаў і ўступак у таргозым дагаворы.

Правая нямецкая прэса піша, што хай сабе Польшчы прызнаюць „права выбару" ў Раду, але ад „права" да выбару—яшчэ вельмі вялікі крок.

Перад сэсіяй Лігі, як і ў сакавіку, на нямецкі ўрад ізноў пасыпаліся даждж ом ноты Рады Паслоў (Антанты) — у справе разбраеньня. Газэта міністра Штрэзэмана, сцьвярджаючы атрыманьне нотаў, лёгкаважна заяўляе, што гэта — звычайная рэч: Рада Паслоў шле ноты толькі для формы, бо на яе націскае ваенна кантрольная камісія.

Гішпанскі дыктатар захістаўся.

У сувязі з вострым канфліктам між дыктатарам Прыма-дэ-Рывэра і радам вышэйшых афіцэраў становішча дыктатара захісталася. Вышэйшыя афіцэры падалі каралю заяву, дамагаючыся адстаўкі дэ-Рывэры. З свайго боку генарал дэ-Рывэра зажадаў ад караля пэўных мераў проці гэтых афіцэраў. Але кароль адмовіўся падпісаць дэкрэты дыктатара і выехаў з Мадрыту, ня прыняўшы навет апошняга.

Фашыстаўская „абарона ліры" і „ваенны хлеб" у Італіі.

Мусоліні заявіў, што ён „за ўсялякую цану" будзе дабівацца абароны італьянскай ліры (італьянскі „злоты", які таксама кульгае, як і польскі). „Я не дапушчу такой ганьбы, каб валюта цудоўнага італьянскага народу пацярпела катастрофу", казаў ён. Дзеля гэтага, пачынаючы ад 1 верасьня, па загаду Мусоліні, „цудоўны народ" мае есьць ужо так-званы „ваенны хлеб"—з рознымі дамешкамі, як было ў часе вайны... Ад 1 верасьня чыстага хлеба ў Італіі пячы ня можна—пад страхам цяжкой кары.—Усё—для цудоўнай ліры, ці, прасьцей кажучы,—для тых абшарнікаў і заграннічных гандляроў, якія вывозяць хлеб з краю... — Зусім, як у нас: спэкулянтам гэтага вывазу ўрад не шкадуе крэдытаў. Будуць і ў нас тыя-ж рэзультаты: ваенны хлеб,—з лебядой ды мякінай...

Паразуменьне ў Мэксыцы.

Каталіцкі япіскапат „паразумеўся" з мэксыканскім урадам, ці папросту пайшоў на ўступкі. Ён згадзіўся на рэгістрацыю ксяндзоў і царкоўных маемасьцяў, ды заявіў, што падпарадкуецца ўсім законам краю. У выніку паразуменьня ўсе касьцёлы ізноў паадчыняліся.

Эміграцкія мітрапаліты пасварыліся.

Мітрапаліты зарубежнай праваслаўнай царквы—Яўлогі і Антоні — страшэнна пасварыліся між сабой. Антоні—на падставе пастановаў Карловацкага Сабору, якога не прызнае Яўлогі, — трэбуе ад апошняга, каб той слухаўся яго. Яўлогі скінуў бэрлінскага япіскапа Ціхана — за тое, што той падпарадкаваўся гэнаму Сабору. Але Антоні паслаў ад сябе прыказ Ціхану, каб ня слухаў Яўлогія, бо той ня мае ўжо над зарубежнай царквой вышэйшай улады, якую ўзяў Сабор... Абодва пазываюцца на каноны, лаюць адзін аднаго. А ніжэйшае духавенства і міране ня ведаюць, каго слухаць... Адным словам—скандал!

Паўстаньне ў Сірыі пашыраецца.

З Бэйруту паведамляюць, што сірыйскія паўстанцы ізноў шпарка заварушыліся і пачалі наступленьне. Султан выдаў адозву — загад, заклікаючы ўсіх на агульную мабілізацыю.

Кангрэс нацыянальных меншасьцяў у Жэнэве.

Беларусы, украінцы і літвіны пакінулі кангрэс.

На першым-жа паседжаньні Кангрэсу нацыянальных меншасьцяў беларусы, украінцы і літвіны патрэбавалі пашырэньня праграмы працы зьезду, дамагаючыся ўключэньня ў яе пытаньняў аб зьмене граніц і — дзяржаўнай незалежнасьці парэзаных народаў. Кангрэс адкінуў гэтыя дамаганьні. Тады прадстаўнікі беларусаў, украінцаў і літвіноў заявілі, што яны ня будуць прымаць учасьця ў працы кангрэсу.

Прадстаўнікі беларусаў, украінцаў і літвіноў, заявіўшы аб адмове ад актыўнага ўчасьця ў працы кангрэсу, асталіся ў салі, як наглядчыкі.

У рэзалюцыі кангрэс, паміж іншым, трэбуе, каб дзяржаўная мова была абавязковай толькі ў адміністрацыі, асабліва налягаючы на тое, што ў школе нацыянальныя меншасьці павінны мець поўную волю для сваей мовы.

З жыцьця „Грамады".

НОВЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ.

У ніжэйпаданых мяйсцовасьцях з'арганізаваліся новыя Гурткі і выбраны Камітэты Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады:

154. 2./VIII. у в. **Лукі**, Жухавіцкае гм., Стаўпецкага пав.
155. 1./VIII. у в. **Серадава**, Косаўскае гм., Косаўскага пав.
156. 8./VIII. у в. **Кулеўшчына**, Гудзевіцкае гм., Горадзенскага пав.
157. 9./VIII. у в. **Аханава**, Дзятлаўскае гм., Наваградзкага пав.
158. 8./VIII. у калён. **Белявічы**, Гарадоцкае гм., Беластоцкага пав.
159. 8./VIII. у м-ку **Карэлічы**, Карэліцкае гм., Наваградзкага пав.
160. 8./VIII. у в. **Хвайняны**, Скідэльскае гміны, Горадзенскага пав.
161. 8./VIII. у в. **Есьнаўцы**, Ражанскае гм., Косаўскага пав.
162. 8./VIII. у в. **Куляны**, Ражанскае гм., Косаўскага пав.
163. 8./VIII. у в. **Бярозаўцы**, Гарадоцкае гм., Маладэчанскага пав.
164. 8./VIII. у в. **Казло**, Індурскае гм., Горадзенскага пав.
165. 8./VIII. у в. **Хайміні**, Малецкае гм., Пружанскага пав.
166. 9./VIII. у в. **Акунёва**, Стэфанпольскае гм., Дзісенскага пав.
167. 2./VIII. у в. **Ханевічы**, Скідэльскае гм., Горадзенскага пав.
168. 9./VIII. у в. **Мурашчына**, Стэфанпольскае гм., Дзісенскага пав.
169. 8./VIII. у в. **Яршэвічы**, Гарадоцкае гм., Маладэчанскага пав.
170. 7./VIII. у в. **Брусы**, Мядзельскае гм., Пастаўскага пав.
171. 7./VIII. у в. **Ліхасельцы**, Вальнянскае гм., Баранавіцкага пав.
172. 7./VIII у в. **Ярашава**, Маўчадзкае гм., Баранавіцкага пав.
173. 4./VIII. у в. **Слабодка**, Мірскае гм., Стаўпецкага пав.
174. 8./VIII. у в. **Малюшычы**, Райцанскае гм., Наваградзкага пав.
175. 8./VIII. у в. **Рэпічы**, Валянскае гм., Баранавіцкага пав.
176. 28./VIII. у в. **Алекшыцы**, Мала-Берастavіцкае гм., Горадзенскага пав.
177. 7./VIII. у м-ку **Варанава**, Лідзкага павету.
178. 8./VIII. у в. **Мастаўляны**, Голынскае гм., Горадзенскага пав.
179. 8./VIII. у в. **Голынь**, Любчанскае гм., Наваградзкага пав.
180. 8./VIII. у в. **Загор'е**, Любчанскае гм., Наваградзкага пав.
181. 8./VIII. у **Забалоцьце**, Карэліцкае гм., Наваградзкага пав.
182. 9./VIII. у в. **Масалянах**, В. Есьмантаўскае гм., Горадзенскага пав.
183. 10./VIII. у в. **Маросьні**, Лебядзеўскае гм., Маладэчанскага пав.
184. 8./VIII. у в. **Лаша**, Лашскае гм., Горадзенскага пав.
185. 12./VIII. у в. **Сьцічанс**, Кіпнішскае гм., Лідзкага пав.
186. 8./VIII. у в. **Доўга**, Сьвятавольскае гм., Косаўскага пав.
187. 8./VIII. у в. **Ендрыхоўцы**, Роскае, гм., Ваўкавыскага пав.
188. 8./VIII. у в. **Вяхотніца**, Роскае гм., Ваўкавыскага пав.
189. 1./VIII. у в. **Снорычы**, Ярэміцкае гм., Стаўпецкага пав.
190. 3./VIII. у в. **Мутвіца**, Марачанскае гм., Пінскага пав.
191. 9./VIII. у в. **Ломніца**, Марачанскае гм., Пінскага пав.
192. 26./VII. у в. **Заброзьдзе**, Пастаўскае гм., Пастаўскага пав.
193. 11./VIII. у в. **Мельнановічы**, Чамерскае гм., Слонімскага пав.
194. 8./VIII. у в. **Крапіўнікі**, Гарадоцкае гм., Маладэчанскага пав.
195. 12./VIII. у в. **Шуляні**, Кастравіцкае гм., Слонімскага пав.

196. 12./VIII. у в. **Слабада**, Іжанскай гм., Вялейскага пав.

197. 7./VIII. у в. **Жычына**, Равятыцкай гм., Пружанскага пав.

198. 8./VIII. у в. **Дамашы**, Лебядзеўскае гм., Маладэчанскага пав.

Мітынг Белар. Сялян.-Работ. Грамады.

(в. Ячны, Дамброўскай гм., Сакольскага пав.).

2./VIII. адбыўся тут мітынг пасла Валошына. Народу было больш як за 1.000 асоб. Хаця папы сумысьля цягнулі службу ў царкве да 4 гадз. і на пропаведзі агітавалі, каб ніхто ня йшоў на веча,—сяляне не паслухалі. Пасол гаварыў аб сучасным палітычным палажэньні; часта яго прамову перарывалі воплескі. Пад канец пасыпаліся кветкі. У прынятай рэзалюцыі сяляне дамагаюцца: амністыі для ўсіх палітычных вязьняў, нацыянальнай раўнапраўнасьці і права на самаазначэньне, зямлі бяз выкупу, работніцкага кантролю над фабрыкамі, дапамогі ўсім безработным, скасаваньня асадніцтва і ўвядзеньня работ. сялян. улады.

Адзін з учасьнікаў.

ХРОНІКА.

Зьезд сяброў Грамады Лідзкага павету мае адбыцца ў Лідзе 5 верасьня. У наступным нумары газэты будзе ўказаны адрэс дому, дзе адбудзецца зьезд.

Недарод у Заходняй Беларусі. Віленшчына сёлета вельмі цяжка пацярпела ад неўраджаю. Як падае „Słowo“, блізу ў-ва ўсіх мясцовасьцях з глілістым грунтам збор збожжа даў па 1—2 цэнтнэру з гэктара зямлі. Навет паласа ля Дзісны, залічаная да рэдкіх у нас пшонных грунтаў, не вярнула насеньня. Усяго недабор у Віленшчыне дасягае паўмільёна цэнтнэраў зерня!

Не ўрадзіла і ў Навагрудчыне, але там недарод меншы.

У сувязі з гэтым абшарніцкая газэта дамагаецца ад ураду дапамогі перадусім для... асаднікаў,—ну, ведама-ж, і для „ясьне панув“.

Канфэрэнцыя ў справе школьніцтва. Канфэрэнцыя прадстаўнікоў Т-ва Беларускае Школы, Літоўскага Культурна Асьветнага Т-ва „Rytas“, Цэнтральнага Жыдоўскага Асьветнага К-ту і Аб'яднаньня жыдоўскіх школ Віленшчыны—з прадстаўнікамі польскага грамадзянства, што прыхільна адносяцца да патрэбаў нацыянальнасьцяў, засяляючых Віленшчыну, адбылася 26 жніўня с. г. у салі Літоўскага Клюбу.

Спасярод больш як трыдцацёх запрошаных палякоў зьявіліся толькі... пяць: адвакат В. Абрамовіч, рэдактар „Przeglądu Wileńskiego“ Л. Абрамовіч, адна учыцелька, пасол Хомінскі ды пан Годвод. Рэшта „не маглі“, або „пахварэлі“. — Відаць, зусім яны здаволены сучасным станам школьніцтва няпольскіх нацыянальнасьцяў...

На канфэрэнцыі прадстаўнікі ўсіх няпольскіх нацыянальнасьцяў абрысавалі жудасны стан свайго школьніцтва і тыя паліцэйскія спосабы, якімі ўлада стараецца задушыць і ўжо ў значнай меры задушыла няпольскія школы.—Пляновасьць і аднолькавасьць спосабаў рэпрэсіяў паказуе, што кіраўніцтва йдзе „згары“—з Варшавы.

Грам. Астроўскі, прадстаўнік ад беларусаў, далажыў аб ліквідацыі польскай уладай беларускіх пачатковых школ.

Прысутныя палякі давалі „лекі“ на гэтыя балячкі.—П. адвакат Абрамовіч, каб палепшыць гэты стан, радзіў зыйсьціся бліжэй з польскімі дэмакратамі і стварыць адумысны К-т усіх нацыянальнасьцяў — разам з палякамі, які-б заняўся школьнымі справамі і г. д; але максімум можа быць здабыты, калі наш край дастане аўтаномію.

Вучыцелька—полька і пасол Хамінскі згаджаліся з сваім папярэднікам, прычым пасол Хамінскі запрапанаваў азнаёміць польскае грамадзянства з няпольскім школьніцтвам у ягоным органе „Kurjer Wileński“, у якім, як ведама, ужо „асьведамляе“ палякоў аб беларусах... Павлюкевіч!

Пан Годвод (польскі сацыялісты) суліў супрацоўніцтва пэпэсаў з „меншасьцямі“ ў школьнай справе, калі тыя, вядучы школьную прапаганду за няпольскія школы, будуць змагацца і за вызваленьне польскай школы з-пад панаваньня клерыкалізму і рэакцыі.

Канфэрэнцыя закончылася бяз ніякіх конкрэтных рэзалюцыяў, пакінуўшы ўражаньне, што шырэйшае польскае грамадзянства ня толькі не жадае зьмены і папраўы стану ня польскага школьніцтва, ды зьмены адносінаў улады да нацыянальных меншасьцяў, але навет баяцца даведацца праўду аб нацыянальным уціску ў Польшчы.

Палітыканства віленскага кураторыуму. Віленскі куратар, ведамы ўжо сваімі варожымі адносінамі да беларусаў, **забараніў** віленскай беларускай гімназіі даць сваю актовую салю пад абход чыста культурнага юбілею беларускае прэсы, які мае адбыцца 19 верасьня—у **нядзелю**, значыцца ў часе вольным ад заняткаў у гімназіі.

Вось яшчэ адзін доказ таго, што зьмена цэнтральнага ўраду ў Варшаве зусім не зьмяніла палітычнага курсу адміністрацыі на мясцох, якая пастараму займае яўна варожую пазіцыю ў адносінах да „меншасьцяў“...

Занятні ў Беларускай Гімназіі пачнуцца 15 верасьня. Дырэкцыя Віленскай Беларускай Гімназіі паведамляе, што заняткі ў гімназіі згодна з распараджэньнем Мін. Асьветы з дня 25 жніўня с. г. пачнуцца 15 верасьня.

Тое-ж і ўва ўсіх іншых школах.

> **Гэтым паведамляецца ўсе сябры**
> **Віленскае арганізацыі**
> **Беларускай Сялян.-Работн. Грамады**
> **аб тым, што ў нядзелю 5 верасьня**
> **г. г. а 10 гадз. раніцы на Віленскай**
> **вул. № 12 п. 7**
> # Агульны Сход Сяброў Грамады.
> **Прысутнасьць усіх сяброў абавязкава.**
> *Камітэт Гуртка.*

Перасьцярога эмігрантам у Францыю. Францускі ўрад аб'яднанае буржуазіі выдаў чыста драконаўскія законы аб работніках эмігрантах, якія едуць дзеля хлеба ў „дэмакратычную“ Францыю. Законы гэтыя аддаюць і нашых эмігрантаў у праўдзівую паншчыну ў руках розных прадпрыемцаў.

Справа ў тым, што эмігрант, які дзеля нялюдзкіх варункаў працы кінуў свайго „хлебадаўцу“ да канца кантракту, ня можа ўжо нідзе дастаць работы. Дык выходзе, што, падпісываючы кантракты на выезд, людзі як-быццам самахоць запрадаюцца ў рабства, з якога ўжо няма выхаду.

Вельмі цяжкім абмежаваньнем правоў эмігрантаў зьяўляецца і тое, што ім забаронена зьмяняць свой фах. Гэтак, хто запісаны ў францускай „карце пабыту“, як, прыкладам, сталяр, ці бондар,—той ніякай іншай працай займацца ўжо ня мае права.

Сьцеражыцеся, работнікі й сяляне, гэнага францускага хлеба!

Новыя зладзействы. У II інспэктарацэ скарбовае палаты ў Вільні выкрыты вялікія надужыцьці сэквэстратараў, якія вялі падвойныя падаткавыя кнігі: адну для сябе, другую—для скарбу. Польская прэса адзначае, што на чале гэнага інспэктарату стаіць нейкі Сакалоўскі, які да вайны быў расейцам, называўся Сакэловым і займаў у Менску „пачэснае“ становішча чорнасоценскае арганізацыі „Союз Міхаіла Архангела“.

Адначасна віленскія газэты падалі вестку, што ў акруговай камандзе паліцыі выкрыты вялікія надужыцьці пры закупцы аўса для паліцэйскіх каней. Вышэйшы ўрадовец паліцыі, які рабіў гэныя закупы, змаўляўся з прадаўцамі і ставіў павялічаныя цэны, кладучы часьць грошы ў свой кішэнь.

Трудна-ж, запраўды, рабіць у дзяржаве „маральную санацыю“, калі ўсе старыя „немаральныя“ ўрадоўцы асталіся на сваіх мясцох — ад верху да нізу!

Афіцыяльны курс грошы на 30-га жніўня. Даляр—8 зл. 95 гр. Залаты рубель — 4 зл. 61 гр.

30. VIII на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,95. Зал. руб. 4,61. Чырвонец 44.

Пісьмо у Рэдакцыю.

Запярэчаньне

STAROSTWO STOŁPECKIE
Nr. 19201/IX

Stołpce, dn. 14 sierpnia 1926 r.

Do Redakcji czasop. „Narodnaja Sprawa“
w Wilnie, Wileńska 12, m. 6.

W związku z zamieszczeniem na stronicy 4-ej Nr. 4-go czasopisma „Narodnaja Sprawa“ z dn. 4 b. m. 2-ch notatek:

1) w sprawie niewydawania przez wójta gminy Stołpeckiej Pietraszewskiego pokwitowań z odbioru pobranych przez sołtysów sum podatków, wskutek czego żądano ponownego wpłacenia tychże podatków i

2) w sprawie przywłaszczenia przez tego Pietraszewskiego 10.000 zł. z sum gminnych i niepociągnięcia jego za to do odpowiedzialności karnej.

Proszę o zamieszczenie w tymże czasopismie, w mysl przepisów art. 21 dekretu z dnia 7/II 1919 r. o przepisach prasowych, sprostowań następujących:

1) Pietraszewski, zabierając od sołtysów pobrane przez nich podatki, dawał niektórym z nich pokwitowania, nie z kwitarjusza gminy, a na kawałkach papieru—prywatne kwitki, posiadanie których, sołtysi ci z namowy Pietraszewskiego ukrywali. Wypadek ten powtórnego pobierania podatków nie spowodował, ponieważ sołtysi wszystkie pobierane podatki wpisują i kwitują w specjalnych książeczkach, w które od r. 1922-go zaopatrywani wszyscy płatnicy podatków w pow. Stołpeckim. Wypadków powtórnego pobierania od kogokolwiek podatków w gminie Stołpeckiej nie stwierdzono.

2) Przywłaszczenie przez Pietraszewskiego zabieranej w powyższy sposób od sołtysów gotówki ujawnione zostało w dniu 6 lipca r. b. i do odpowiedzialności karnej za to został on pociągnięty pismem z dnia 12 lipca r. b. Nr. 2990, przesłanem do p. Sędziego Sledczego 1-go rewiru pow. Stołpeckiego. Przywłaszczenie sięgało sumy nie 10.000 zł. lecz 6.000, z których Pietraszewski do obecnego czasu 2.000 zł. zwrócił. Od czasu ujawnienia przestępstwa Pietraszewski od wykonywania obowiązków wójta został usunięty.

(Подпіс нявыразны).

Starosta.

Дай адказ.

Дай адказ мне, што шукаеш,
Мой гаротны, бедны брат;
Да каго ты зварачаеш
Повен жальбы свой пагляд?
І каму нясеш ты скаргу,—
Хто пачуе стогн грудзей,—
Цяжкі стогн пакуты, гора
Абяздоленых людзей?
Дай адказ, чаго чакаеш,
На каго ты жджэш,—скажы?—
Браце!—колькі сілы маеш,
Ўсю да працы прылажы,
Бо ніхто не дапаможа:
Цябе здрадзяць, асьмяюць;
Замест ласых абяцанак
Ланцугамі закуюць.
Навучыла нас, здаецца,
Гора—злыбяда, як жыць;
Дык змагайся, покі б'ецца,
Покі сэрца йшчэ дрыжыць.
Зварухні запас вялікі
Сіл, што схованы ў табе;
З вусн хай льлюцца песьняў зыкі:
Кліч магутны к барацьбе!
Не зламае цябе вораг,
Колькі-б сілаў ён ні клаў,
Бо ты крыўду ў сэрцы маеш,
Бо ты ведаеш, што праў.
Грудзі ўздымуцца высока,
Сэрца помстай закіпіць:
Сьцеражыся, хцівы злыднік,—
Я таксама хачу жыць!
Знай,—калісь над гмахам нiваў
Зорка волі нам ўзыдзе,
Зажывём і мы шчасьліва
У свабоднай Грамадзе!

Міхась Васілёк.

Карэспандэнцыі.

Паліцыя не прызнае законаў!

(Лідзкі павет).

Да даверанай асобы Цэнтральнага Сэкрэтарыяту—З. Сарокі — зьявіўся 4 жніўня камэндант пастэрунку Дакудава і запытаўся:

„Што Сарока атрымаў з пошты“? Адказ быў: пісьмо з „Грамады“. Паліцыянт вытарашчыў спачатку вочы, а пасьля адабраў у селяніна бляжкі дэкларацый і запросін на сходы. Выходзячы заявіў, што за ўсялякія сходы „zapakuję do więzienia“. Камэндант пастэрунку быў з карабінам.

Пыталіся пана старосты Лідзкага павету, ці вядомы яму самавольны і беззаконны паступак паліцыянта ды калі будуць зьвернены забраныя ў селяніна блянкі.

Добры дзень і бывайце здаровы.

(Слонімшчына).

Сяляне вёскі Варонічы, Міжэвіцкае гм., Слонімскага пав., едучы па сена на пожню ў Добры Бор, сустрэліся з нейкім панком. Пасьля некалькіх слоў гутаркі панок пачаў пытацца: ці ёсьць у іхняй вёсцы камітэт ППС, а калі сяляне адказалі, што няма — размалёўваў ён працу й мэты ППС. Гаварыў, што па ўсім вёскам абшару ад Жырава да Д-Бору (Слонім. пав.) ёсьць камітэты ППС, асабліва паказаў на вёскі Русакова ды Сьцянявічы Шылавіцкае гм. Сьпярша слухалі яго сяляне, як добра бае, ды ведаючы аб здрадзе гэтай партыі адказалі: калі-б хто з ППС зьявіўся ў іх вёску, дык мятлою прагналі-б яго сяляне і, што сяляне в. Варонічы вітаюць Беларус. Сел. Рас. Грамаду, у якую ахвотна запісваюцца. Пачуўшы гэта, „паўпанок“ пакінуў гаварыць, як вады ў рот набраўшы. Жадаем, каб гэтак адказвалі пэпэсам усе нашы сяляне. А калі праўда, што в. Русакова і Сьцянявічы маюць камітэты ППС, дык напэўна скора яны пераканаюцца аб сваей аамылцы.

Б. М.

Гульней у карты долі ня выіграеш.

(М. Гарадок, Беластоцкага павету).

У нас, у Гарадку з'арганізаваўся гуртон Бел. Сял.-Работ. Грамады ўжо 3-ці месяц, але працуе слаба, дзеля таго, што ёсьць тут пара людзей, якія ўвесь час замінаюць.

Гэта Я. Астравецкі, жыхар вёскі Пяньноў, але жыве ў Гарадку, а другі М. Хранускі з вёскі Зарачаны. Гэная неразлучная пара бараноў вельмі перашкаджае расшырэньню гуртноў, як у Гарадку, так і па вёсках. Кожнага знаёмага і незнаёмага чалавека яны страшаць;—кажуць: як запішашся ў гуртон, то будзеш сядзець хутка ў вастрозе, як сядзелі і яшчэ сядзяць пару нашых хлопцаў і што старшыню гуртка ў Гарадку біў камэндант паліцыі па твару ды казаў: „згніе ў вастрозе разам з сваім гуртком“.—І чаго толькі яны ня выдумываюць.

Што камэндант пастарунку біў старшыню гуртка, то гэта зусім няпраўда—гэта злосная выдумка Астравецкага з яго бараняй галавы.

Самае важнае тое, што гэная пара людцоў, а найбольш Я. Астравецкі ўносіць сярод маладых—17-18-летніх хлопцаў вельмі вялікую і страшэнную хваробу. Хвароба гэта—гульня ў карты на грошы. Няма тае нядзелі, каб ня было гэнай

гульні. Скажу праўду, што, забраўшы чалавек 7-8 маладых хлопцаў, Я. Астравецкі мае вялікую карысьць з гэнай гульні: ён, як стары шулер, абыгрывае іх і дзярэ грошы. Вы, маладыя хлопцы, ня слухайце дурных старых асталопаў, на картах долі ня выграеце. Лепш змагайцеся з іншымі за свае правы. У вольны час збірайцеся, чытайце супольна газэту, абгаварывайце Вашы супольныя справы. **Тойсамы з Гарадка.**

Сэквэстратары.

(Вынятак з вялікай карэспандэнцыі).

(Беніцкая гм., Маладэчанскага пав.).

У грам. Міхала Асіповіча з фал. Нова-Поля забралі на падаткі апошняе сена, не пакінуўшы на зіму ані жмені. У грам. Анны Асіповіч забралі апошнюю сьвіньню, пакідаючы 3-х дзённых парасяты.—Як прыйшлі па сьвіньню, — гаспадыня была дома,—сэквэстратар з паліцыянтам самы шукалі яе на выгане, дзе дзяўчынка пасьвіла сьвіньню. Дзяўчынка пачала прасіцца, каб пачакалі гаспадыні, а як не паслухалі, то падняла плач і крык, — зьбегліся людзі на гэта. „Паляўнічыя" прасілі людзей памагчы злавіць сьвіньню, але — ясна—ніхто не паслухаў, кажучы: „сёньня гэтую возьмеш, а заўтра прыедзеш па нашы"! Тады сэквэстратар заткнуў дзяўчынцы рот, каб ня крычала, а паліцыянт „наводзіў парадак сярод сьвіней." Не злавіў, загнаў яе ў лес;—праз некалькі дзён прыйшла сьвіньня, а ўсё-ткі падпільнавалі і забралі.

У Паўла Асіповіча з фал. Макрошчыцы за 58 зл. 60 гр. гэтыя сэквэстратары хацелі забраць жарабя—двузімка і карову, што варта 260 зл. — (Раней за гэты падатак апісалі 10-ці месяч. жарабя, а як прыехалі, то лепшае выбралі). Жывіну забіралі, а сэквэстрацыйных пратаколаў ня пісалі і выдавалі квіты без пячатак. **Полен Алекса.**

Начальства.

(В. Маслава, Міжэвіцкае гм., Слонімскага павету).

Рыгор Наумчык, ад часу як стаў солтысам—лічыць сябе вялікім начальствам. Паіць мусіць яго кожны; калі часам спозьніцца на хрэсьбіны, ці іншае якое сьвята—прыйдзе сам на другі дзень. Як ня даць яму, лічылі людзі: за бутэльку абецаваў ён звольніць нававбранцаў з войска.

Хадзілі ў нас увесь час чуткі, што Наумчык —забойца, што задушыў ён дзеля кражы свайго суседа ў 1923 годзе. Людзі ведалі, але баяліся гаварыць—ведама начальства мае сілу, за ім—паліцыя, а тая пакуль суд і справа—не разьбіраецца.

Адзін селянін—Рыгор Куляшэвіч пераканаўшыся, што забойства фактычна было зроблена ім —пачаў баіць голасна аб гэтым суседзям.

Куляшэвіча адразу арыштавалі, па даносу солтыса, але ў канцы шыла з мяшка вылезла.

Зрабілі обыск у Наумчыка ды знайшлі рэчы забітага ў 1923 годзе суседа.

Вось якое ў нас начальства. **Х.**

Бандыт.

(Камянская гм., Горадзенскі пав.).

Пан Эмбрык з Мількавіцкага двара дужы, як конь. Панам цяпер усё можна—дык б'е ён людзей направа і налева. Згадзіўся ў яго за пуд жыта селянін Х. Януцэвіч. Жыта падаражэла, дык пан хлеба не дае і хоча плаціць грашмі, але па старой цане. Калі Яеуцэвіч заспорыў — зачыніў пан дзьверы на ключ ды пачаў біць чалавека ў твар. Шчасьце, што на выплату прыйшла якраз сялянка М. Януцэвіч ды такім чынам ён уратаваўся.

Тое самае з другім жыхарам нашай вёскі М. Гарошкам. Пайшоў той у панскі лес нагрябсьці лісьця. Глядзіць—Эмбрык. „Хто па'зволіў хадзіць па лесе? запытаўся ён.

Міхал кажа: хіба ня трэба было пытацца аб лісьцё.

Заспорылі.

Пан схапіў Гарошку, падняў вышэй сябе ды так ударыў аб пень, што той ляжаў доўгі час бяз памяці.

Цяпер у шпіталю. Мае пераломаную скабу. **Бачыўшы.**

Катуюць!

(Косаўшчына).

Каля вёскі Галенчыцы, Борка-Гічыцкай гміны—праходзіць дзяржаўны лес. Лясьнічы п. Дубчынскі саўсім здурнеў, бо не дае ён карыстацца дарогай, якая праходзіць праз дзяржаўны лес да нашай сенажаці. Піша за гэта на людзей пратаколы і „мілуе" толькі тых, што нізка яму кланяюцца.

Шмат гора цярпім ад гэтага чыноўніка. Даўней на балотах каля лесу—мужыкі драли лазу на лапці і ніхто ім не забараняў. Цяпер — нельга. Вось нядаўна зявалі пан лясьнічы з сваім слугой сялян Лахая Арцема і Якуба Макарэвіча пры лазе—адабралі яе і парубалі ім тапары. Старыка Лахая (мае 60 гадоў) лясьнічы ўдарыў у грудзі так, што той напэўна доўга жыць пасьля гэтага ня будзе. **Недалёкі.**

Панскія сабакі.

(М. Вішнева, Валожынскі пав.).

Нядаўна былі мы сьведкамі новых гвалтаў. Пайшлі нашы местачковыя бабы і дзеці ў букатаўскі лес, ды спаткаліся з лясьнікамі.

Прыляцелі яны ў трох (Пупа, Кулак і Скаўрон) адабралі ягады і кошыкі, пабілі збаны. Былі з імі і запраўдныя сабакі. Яніне Шынкевіч парвалі сабакі ўсю спадніцу. Дзеці напужаліся і цяпер хварэюць.

Лясьнікі-ж—горш ад сабак. Змусілі яны некатарых баб на каленях прасіць, каб іх ня білі і не скавалі.

Па два злоты налажылі на кожную штрафу.

Выслужывайцеся, выслужывайцеся, халуі. Дачакаецеся яшчэ свайго. **Вішнеўскі.**

Нам пішуць з вёскі што:

✕ Поп м. Росі, Ваўкавыскага пав., за хрышчэньне бярэ 6 зл., каўбасу, кусок хлеба і кусок палатна, за шлюб—50 зл. і г. д. Калі памрэ бедны і ня маюць за што пахаваць, то поп кажа: „Завядзі каня ці карову да жыда ў залог, прынясі грошы,—тады пахваю". А 8./VIII. с. г. на пропаведзі за тое, што ня ходзяць у царкву, пагражаў паліцыяй, што яна будзе пісаць пратаколы і заганяць людзей у царкву.

Паштовая скрынка.

Гр. Салаўю. Для інтэрпэляцыі паслам патрэбны прозьвішчы асоб і канкрэтныя выпадкі.

Грам. Ендрыку—Бодрыку. Аб Вашай просьбе ў справе пасольскага мітынгу Сял.-Раб. Грамады на 8 верасьня ў Браслаўлю—мы паведамім паслоў. Цяпер яны ў раз'ездзе. Калі змогуць—прыедуць.

Гр. „Ялаўскаму". Карэспандэнцыя Ваша няцікава для нашых чытачоў. Пішэце аб сялянскім жыцьці, аб фактах, крыўдзячых селяніна, — скарыстаем.

Грам. „Прахожаму" і „Таму самаму з Гарадна". — Газэту высылаем.

Грамадзянам, прыслаўшым вершы: скарыстаем, або дамо адказ у наступных нумарох.

Грам. „Шраму Рабочаму". Карэспандэнцыю Вашу не зьмясьцілі мы ўцэласьці з тэй прычыны, што яна не падходзіць.

Пяром Вы ўладаеце і пісаць карэспандэнцыі можаце свабодна, але ў прысланай неправільны ў Вас падход да справы.

Для Вас дзіўным зьяўляецца, што поп Ф.—„прапаведнік слова Божага, не баючыся граху і ня стыдаючыся сваіх таварышаў па фаху,—цешыцца з крыві і кліча другіх на крывавы пір"; — мы-ж лічым, што ўсе прапаведнікі, выключаючы мо' адзінкі (што дзела не мяняе), служаць пануючым клясам і прапаведываюць тое, што ім патрэбна.

Калі не згаджаецеся з намі, пішэце, будзем спрачацца!

Папрабуйце даць нам абразкі жыцьця і барацьбы работнікаў, разам з якімі працуеце.

Грам. „Грашу".—Вы пішаце, што „хочаце высказаціца ў тым кірунку, для якога працуеце". Шкада, што якраз гэтай карэспандэнцыі зьмясьціць ня можам: даўгая яна і шмат у ёй вады. Папрабуйце пісаць карацей і больш фактаў.

Калі „Беларуская Крыніца" перакруціла Вашу думку ў карэспандэнцыі,—заняніўшы словы „Нацыянальны Камітэт"—славамі „Сялянскі Саюз" — нічога мы зрабіць ня можам. Радзім Вам другі раз не пасылаць туды пісем, дык рэдакцыя „Беларускай Крыніцы" ня будзе мець магчымасьці перакручываць.

Атрымана:

Ад:—Кастуся Халімончыка, Рамана Морды, Рахмана Умбера, Наума, Хартановіча, Янкі Міцкевіча — **па 1 злот.**

АБВЕСТКА.

Надзвычайны Агульны Сход Сяброў Таварыства Беларускае Школы 8-га жніўня г. г. не адбыўся дзеля браку патрэбнага ліку сяброў. З гэтае прычыны 8 верасьня г.г. у 4 гадзіны дня ў памяшчэньні Таварыства—Віленская 12 — паўторна адбудзецца Надзвычайны Агульны Сход Сяброў, які будзе правамоцны пры любым ліку сабраўшыхся Сяброў.

Парадак дня той самы: 1. Рэарганізацыя Т-ва паводле нова-зацьверджанага Статуту г. з. дзеля выбару Галоўнае Управы Наглядное Рады; 2. Бягучыя справы.

Галоўная Управа Т-ва Бел. Школы.

Ніколі не зьніштажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаёмаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

Адказны-Рэдактар: Т. Крачына. Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22. Выдавец пасол на Сойм П. Мятла.